ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 37 (237) | Субота, 18 снежня 1976 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## СЕСІЯ ГАРАДСКОГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

14 снежня адбылася дзевятая ›есія Гомельскага гарадскога ›авета дэпутатаў працоўных 5-га склікання.

Сесія разгледзела наступныя ›ытанні:

1. Аб дзяржаўным плане раз›іцця народнай гаспадаркі гора›а Гомеля на 1976—1980 гады › плане развіцця народнай гас›адаркі горада на 1977 год. З ›акладам выступіў старшыня ›арвыканкома **В. М. Адаменка.**

2. Аб бюджэце горада Гоме›я на 1977 год і аб зацвяр›жэнні справаздачы аб выка›анні бюджэту за 1975 год. Даклад па гэтаму пытанню зра›іў загадчык фінансавага ад›зела гарвыканкома **Д. П. Кузьменка,** садаклад — стар›шыня планава-бюджэтнай камісіі гарадскога Савета **М. В. Мораў.**

Сесія аднадушна адобрыла і зацвердзіла план развіцця народнай гаспадаркі горада на 1976—1980 гады і план развіцця народнай гаспадаркі горада на 1977 год, бюджэт горада на 1977 год і справаздачу аб выкананні бюджэту за 1975 год.

Сесія зацвердзіла перспектыўны комплексны план работы гарадскога Савета і яго выканкома на 1977 год.

## У ПАРТКОМЕ

Пазаўчора адбылося чарговае пасяджэнне партыйнага камітэта ўніверсітэта. Заслухана пытанне «Аб падрыхтоўцы рэзерву прапагандыстаў на эканамічным і гісторыка-філалагічным факультэтах». Са справаздачай выступіў дэкан факультэта грамадскіх прафесій Я. Я. Вяршыгара. У абмеркаванні пытання прынялі ўдзел члены парткома: загадчык кафедры навуковага камунізму В. В. Серыкаў, дэкан эканамічнага факультэта І. П. Трацэўскі, сакратар партыйнага камітэта У. В. Казлоў.

Прынята пастанова, у якой прадугледжаны меры па карэннаму паляпшэнню падрыхтоўкі рэзерву прапагандыстаў ва ўніверсітэце.

## ...ЮЧАНАСЦЬ ...ВЕДАХ

...і паспяхова здаць зімовую ... актывістаў выступілі дэкан ... Трацэўскі, дэкан факультэта ...есій Я. Я. Вяршыгара, член ...Бондараў.

**Т. РУБАН,**
**кіраўнік прэс-цэнтра факультэта.**



**...студэнткі-выдатніцы гр. 0-23 ...культэта Наталля Баброўніка...ава. Вучобу яны спалучаюць ...яткамі ў навуковым гуртку, ... паглыбляць і пашыраць веды ...цыяльнасці.**

**...ы карэспандэнт, студэнт эка...льтэта А. Мажараў зафатагра...у лабараторыі за апрацоўкай ...рмацыі.**

## ТЫДЗЕНЬ УНІВЕРСІТЭЦКАГА ЖЫЦЦЯ

● Днямі студэнты і выкладчыкі нашага ўніверсітэта праслухалі лекцыю «Эканоміка СССР і знешнія гандлёвыя сувязі». З ёй выступіў у актавай зале кандыдат эканамічных навук, дацэнт Маскоўскага інстытута міжнародных зносін С. П. Нікіцін.

● Больш 30 супрацоўнікаў універсітэта заўтра адправяцца ў цікавае чатырохдзённае турыстычнае падарожжа экскурсійным поездам па маршруту Гомель — Рыга — Вільнюс — Гомель. Ільготныя пуцёўкі для іх выдзяляе мясцком. Для пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва яны будуць бясплатнымі.

● На гістарычным аддзяленні першакурснікі з вялікай цікавасцю слухаюць лекцыі па курсу гісторыі СССР XVIII стагоддзя, якія чытае прафесар Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава М. І. Бяляўскі. Вядомы вучоны з Масквы вядзе таксама спецсемінар для студэнтаў чацвёртага курса.

● Кніжны фонд універсітэцкай бібліятэкі штогод папаўняецца амаль на сорак тысяч экземпляраў. Работнікі бібліятэкі рэгулярна наладжваюць прагляд навінак. Гэтымі днямі адбылася выстаўка паступіўшай літаратуры ў вучэбным корпусе № 2, дзе да ўвагі студэнтаў і выкладчыкаў было прадстаўлена каля 300 экземпляраў новых кніг.

● Супрацоўнікі лабараторыі электронікі распачалі комплексныя работы па распрацоўцы высокаомных прэцыёзных інтэгральных схем. Вырашэнне гэтай актуальнай праблемы забяспечыць высокі эканамічны эфект у вытворчасці прыбораў.

● Калектыў кафедры філасофіі прыступіў да выканання гаспдагаварной тэмы: «Выяўленне фактараў стабілізацыі кадраў на прадпрыемстве». Даследчая работа праводзіцца на Гомельскім заводзе «Цэнтраліт» і 12-м падшыпнікавым заводзе.

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі ўніверсітэта, выкладчыкі і студэнты эканамічнага факультэта горача віншуюць старшага выкладчыка кафедры механікі АКУЛІЧА Мікалая Уладзіміравіча з зацвярджэннем яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук.**

## ...ШАКУРСНІКАЎ

На фінішы турпахода для ...го ўдзельнікаў камітэт ...ТСААФ універсітэта арганіза...аў сустрэчу з ветэранамі Вя...кай Айчыннай вайны, удзель...камі вызвалення Гомеля ад ...ямецка-фашысцкіх захопні...аў.

Перад тымі, хто адпраўляўся да славутай партызанскай «Крынічкі», выступіў былы начальнік коннай разведкі партызанскай брыгады «Бальшавік» С. М. Глікер. Перад студэнтамі другой групы выступіў удзельнік баёў за вызваленне Гомеля І. П. Ахматаў.

Першакурснікі з вялікай увагай выслухалі ветэранаў, запэўнілі іх, што сваёй выдатнай вучобай і актыўнай грамадскай працай будуць памнажаць слаўныя традыцыі старэйшых пакаленняў.

Больш 500 удзельнікаў турпаходу выканалі нормы комплексу ГПА.

**В. ДЗЕМ'ЯНКОЎ,**
**старшыня камітэта ДТСААФ.**

ДА 50-ГОДДЗЯ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАДЗЕІ

# ДРУГОЕ ЎЗБУЙНЕННЕ БССР

У снежні 1922 года адбылася найвялікшай важнасці падзея ў жыцці ўсіх народаў нашай краіны — быў утвораны Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. У гісторыі савецкіх народаў пачалася новая старонка, адкрылася шырокая перспектыва іх палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця.

Толькі ў складзе Савецкага Саюза, у брацкім супрацоўніцтве з усімі народамі краіны працоўныя Беларусі маглі адстаяць незалежнасць і ўмацаваць суверэнітэт сваёй нацыянальнай дзяржавы, дабіцца кансалідацыі ўсяго беларускага народа ў рамках адзінай сацыялістычнай дзяржавы, у велізарных памерах развіць прадукцыйныя сілы рэспублікі, дасягнуць небывалых вышынь у станаўленні беларускай сацыялістычнай культуры.

Да 1924 года ў склад БССР уваходзіла толькі трэцяя частка беларускай этнічнай тэрыторыі. Многія паветы былых Віцебскай і Магілёўскай губерняў, хаця ў іх і пераважала беларускае насельніцтва, ва ўмовах ваеннага часу і замежнай інтэрвенцыі было прызнана мэтазгодным пакінуць у складзе РСФСР. Але з заканчэннем грамадзянскай вайны і пераходам да мірнай стваральнай працы па будаўніцтву сацыялізму ўзнікла неадкладная патрэба ва ўз'яднанні ўсіх тэрыторый з перавагай беларускага насельніцтва ў рамках адзінай рэспублікі.

Улічваючы гэта, 3 сакавіка 1924 года ВЦВК выдаў дэкрэт аб перадачы Беларускай рэспубліцы 16 паветаў пераважна з беларускім насельніцтвам са складу Смаленскай, Віцебскай і Гомельскай губерняў Расійскай Федэрацыі. У выніку гэтага першага ўзбуйнення тэрыторыя рэспублікі павялічылася больш, чым у два разы, а насельніцтва амаль патроілася — з 1,5 мільёна да 4,2 мільёна чалавек. Узбуйненая Беларусь аб'яднала 97 працэнтаў беларусаў, пражываючых на тэрыторыі СССР.

Імкненне да ўз'яднання з Беларуссю раёнаў з пераважаючым беларускім насельніцтвам выразна праявілася яшчэ ў снежні 1923 года на VII Гомельскім Губернскім з'ездзе Саветаў, які, улічваючы, што большасць насельніцтва тагачаснай Гомельскай губерні з'яўляецца беларускім і надаючы вялікае значэнне пытанню развіцця нацыянальнасцей, вынес рашэнне аб далучэнні Рэчыцкага, Гомельскага, Рагачоўскага, Магілёўскага і Клімавіцкага паветаў да Беларускай рэспублікі.

Аднак пры першым узбуйненні БССР у 1924 годзе гэта рашэнне поўнасцю не было выканана: па некаторых гаспадарча-эканамічных меркаваннях Гомельскі і Рэчыцкі паветы былі адначасова пакінуты ў саставе Гомельскай губерні РСФСР. Зыходзячы з задачы паспяховага правядзення індустрыялізацыі Беларусі, вясной 1926 года ЦК КП(б)Б і СНК БССР сталі будзіраваць пытанне аб уз'яднанні гэтых паветаў з Беларуссю. Іх законнае патрабаванне, якое выражала волю ўсяго беларускага народа, знайшло поўную падтрымку ў ЦК ВКП(б) і цэнтральных органах Савецкай улады.

Але супраць гэтага ўз'яднання выступілі вялікадзяржаўныя шавіністы, сярод якіх аказаўся рад адказных партыйных і савецкіх работнікаў Гомельскай губерні.

Супраць далучэння Гомельскага і Рэчыцкага паветаў да Беларусі выступіў у сваім рашэнні і закрыты пленум Губкома, які праводзіў сакратар Гомельскага губкома Д. Р. Заслаўскі па дазволу сакратара ЦК ВКП(б) В. М. Молатава ў верасні 1926 года. Пленум заявіў, што гэтыя паветы не маюць пераважнай большасці беларускага насельніцтва і іх далучэнне да БССР «значна пашкодзіць эканоміцы РСФСР».

У сапраўднасці, большасць насельніцтва гэтых двух паветаў складалася з беларусаў. У 1925 годзе, напрыклад, працэнт беларусаў на паветных з'ездах складаў па Рэчыцкаму павету — 75, а па Гомельскаму — 79 працэнтаў. Такая ж карціна назіралася і ў нацыянальным саставе Сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі; па Рэчыцкаму павету беларусы складалі 85, па Гомельскаму — 74 працэнты.

Улічваючы такія абставіны і кіруючыся прынцыпамі ленінскай нацыянальнай палітыкі, ЦК ВКП(б) вырашыў гэта пытанне ў інтарэсах беларускага народа. Палітбюро ЦК ВКП(б) прыняло рашэнне аб далучэнні да БССР Гомельскага і Рэчыцкага паветаў былой Гомельскай губерні. Аб'яднаны пленум Гомельскага ГК і ГКК (1—2 снежня 1926 года), на якім прысутнічалі і выступілі з прамовамі сакратар ЦК ВКП(б) М. М. Швернік, сакратары ЦК КП(б)Б А. І. Крыніцкі, І. А. Адамовіч, М. М. Галадзед, сакратар Бранскага ГК А. Н. Рабаў, С. М. Будзённы і іншыя адказныя партыйныя і савецкія работнікі, даў рашучы адпор вялікадзяржаўным шавіністам, аднадушна адобрыў рашэнне Палітбюро аб далучэнні Гомельскага і Рэчыцкага паветаў да Беларусі і даручыў Губкому прыступіць да пераўтварэння яго ў жыццё.

6 снежня 1926 года ВЦВК РСФСР прыняў рашэнне аб расфарміраванні Гомельскай губерні, а 31 снежня адбылося апошняе пасяджэнне аб'яднанага пленума Гомельскага губкома і ГКК. Прынятыя на ім рашэнні сведчылі аб тым, што састаў губкома зрабіў правільныя вывады з раней дапушчаных памылак і правёў энергічную работу па растлумачэнню рашэння ЦК ВКП(б) аб ліквідацыі губерніі і дабіўся правільнага яго засваення ўсёй партыйнай арганізацыяй і асноўнымі масамі рабочага класа і сялянства.

Архівы захавалі дзесяткі рэзалюцый, у якіх працоўныя адабралі рашэнне партыі і ўрада аб уключэнні Гомельскага і Рэчыцкага паветаў у састаў БССР.

Далучэнне Гомельскага і Рэчыцкага паветаў да Беларусі завяршыла працэс ўз'яднання ўсіх беларусаў, якія жылі ў межах СССР, у рамках нацыянальнай дзяржаўнасці. Тэрыторыя БССР у выніку другога ўзбуйнення павялічылася на 14 працэнтаў, насельніцтва — на 15 працэнтаў, узрос прамысловы патэнцыял рэспублікі: валавая прадукцыя буйной прамысловасці БССР павялічылася на 36 працэнтаў, колькасць прамысловых рабочых — на 30 працэнтаў.

**Г. ЕЎДАКІМЕНКА,**
**загадчык кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі, дацэнт.**

**НА ВАРЦЕ ПРАВАПАРАДКУ**

# АДЗІН ВЕЧАР ДР

Стрыманы гул галасоў... Ажыўленыя твары... Пачынаецца рэгістрацыя дружыннікаў, якія прыйшлі на дзяжурства.

Чарга да стала камандзіра ДНД на гэты раз асабліва вялікая: на ахову правапарадку выходзяць студэнты фізічнага факультэта. Дружына фізікаў налічвае ў сваіх радах каля 150 чалавек і з'яўляецца лепшай ва ўніверсітэце. У гэтым вялікая заслуга яе камандзіра Л. Ігнаткевіча і самых актыўных членаў ДНД — студэнтаў другога і трэцяга курсаў.

У пакоі, дзе размяшчаецца штаб дружыны Цэнтральнага раёна г. Гомеля, усталёўваецца цішыня. Размяркоўваюцца абавязкі паміж дружыннікамі, фарміруюцца саставы груп, прызначаюцца старэйшыя. Усё праходзіць у абстаноўцы дзелавітасці. Самыя актыўныя члены добраахвотнай народнай дружыны факультэта І. Злотнікаў, А. Цянін, А. Зарытаў, А. Цяцянюк, М. Сорын, А. Крывалапаў, Л. Міхайлава, Т. Белагурава, Г. Валавікова ў прыўзнятым настроі: як лепшыя камсамольцы-дружыннікі яны ўзнагароджаны граматамі камітэта камсамола ўніверсітэта і каштоўнымі падарункамі.

Заданне атрымана, і ўсе разыходзяцца па сваіх маршрутах. Спецгрупа, у саставе якой два пазаштатныя супрацоўнікі міліцыі і тры дружыннікі з фотаапаратам, выходзіць на ахову парадку апошняй. Яе мэта — свабодны пошук. У штабе застаюцца толькі дзяжурныя.

Цэнтральныя вуліцы горада заліты святлом. Хтосьці спяшаецца дамоў, хтосьці — па сваіх справах. Некаторыя проста прагульваюцца.

На кожнай вуліцы ёсць свае «гарачыя кропкі», напрыклад, такія, як каля гастраномаў «Космас» і «Паўднёвы». На адной з такіх «кропак» мы засяроджваем увагу. Фатографу спецгрупы «не пашанцавала»: літаральна за некалькі мінут да нашага прыходу міліцыя затрымала трох п'яных дэбашыраў. Цяпер тут не будзе зручнага моманту для здымак.

Сустракаем нашых рабят, якія патрулююць на суседняй вуліцы. Яны паспелі ўжо наведаць сваіх падшэфных —школьнікаў, якія стаяць на ўчоце ў



**НА ЗДЫМКУ: на апорным пункце № 3 Цэнтральнага аддзела ўнутраных спраў г. Гомеля. Дружыннікаў ГДУ інструктуе лейтэнант міліцыі П. Шабулдаеў.**

Фота **У. Маглышава.**